ПАЦДАРМ

Сумесны праект рэдакцыі газеты «Звязда» і Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь

Выпуск № 6 (57)

■ З першых вуснаў

СЛУЖЫЦЬ — ДЫК З МУЗЫКАЙ!

Пра што спяваюць сучасныя салдаты і ці ёсць будучыня ў ваенна-патрыятычнай песні?

Сяргей Макей — у вайсковым асяроддзі фігура вядомая. Яго песні гучаць не толькі ў салдацкім страі, а і на вялікіх сцэнах, шматлікіх канцэртных пляцоўках, у тым ліку на парадзе войск у гонар Дня Незалежнасці. Іх з задавальненнем спяваюць вайскоўцы, выконваюць вядомыя артысты і калектывы. Ды і самога аўтара Бог голасам не пакрыўдзіў. Калі б не армейская выпраўка і не афіцэрскія пагоны, то наўрад ці здагадаўся б, што маеш справу з вайскоўцам — не больш не менш, а з палкоўнікам запасу.

— Сяргей Аляксандравіч, вы аднойчы сказалі, што песня і жыць, і служыць дапамагае...

— Ёсць такая прыказка, як адзін у полі не воін. Вось прыйшлі ў войска хлопцы — усе розныя, са сваімі інтарэсамі. І як іх сабраць разам, як згуртаваць? Толькі песняй. Гэта першае, што дазваляе адчуць зладжанасць калектыву. Калі ўсе разам спяваюць, адбываецца такі ўздым: адчуваеш не толькі локаць таварыша ў страі, а і думкі, якія песня выказвае. Гэта яднае калектыў, ён становіцца больш дружным. Да таго ж, гэта проста прыгожа. Калі я вучыўся ў Ваеннай акадэміі, мы, ужо сталыя афіцэры, не раз спявалі ў страі. Аднойчы курсанты, якія вучыліся побач, выбеглі на вуліцу, каб паслухаць і паглядзець. Настолькі моцна і зладжана гучала песня. Мне было асабліва прыемна, бо спявалі тады маю песню на беларускай мове «Айчыны нашай сцяг». Дарэчы, гэта першая песня, напісаная мною на вайсковую тэматыку.

— Ці прыгадаеце, пра што была ваша самая першая песня ўвогуле?

— А што можа натхніць 14-гадовага хлопца? Вядома ж, каханне! Прычым без адказу. За плячыма была музычная школа, дагэтуль спрабаваў пісаць вершы. Таму не скажу, што ў плане вершаў гэта была першая спроба пяра.

— Тым не менш вырашылі насіць афіцэрскія пагоны... Ці гэта быў не ваш выбар?

— Гэта было абсалютна маё рашэнне. Яшчэ калі ў шасцігадовым узросце мяне спыталі, кім я буду, адказаў: «Салдатам!» Хутчэй за ўсё на мой выбар паўплывала асяроддзе, у якім я вырас. Па-першае, у Валожыне, дзе жылі, размяшчалася воінская часць. Па-другое, уся сям'я была звязана з арміяй. Вайскоўцам быў бацька, служыў у арміі родны брат. Загадчыкам бібліятэкі пры вайсковай часці 40 гадоў адпрацавала мая маці. Пасля заканчэння Чарапавецкага вышэйшага ваенна-інжынернага вучылішча радыёэлектронікі прыйшоў у валожынскую брыгаду і я. 85 гадоў — такі сямейны стаж службы толькі ў брыгадзе. Увогуле Узброеным Сілам наша сям'я прысвяціла каля 95 гадоў!

— Што прымусіла падчас службовага шляху зноў заняцца творчасцю?

— Калі не ўлічваць той час, калі я ствараў песні ў школьным ансамблі, пісаць на вайсковую тэматыку пачаў будучы камандзірам роты. Якраз у гэты час з'явілася незалежная дзяржава пад назвай Беларусь. А што спяваць беларусам у войску? «По долинам и по взгорьям шла дивизия вперед»? Каб знайсці песню, якую мае вайскоўцы будуць выконваць у страі, пайшоў у бібліятэку. Пра сучасную армію на беларускай мове там нічога не было. Думаю, знайду хоць якія вершы, калі песень няма. Але і вершаў бракавала. Тады паспрабаваў перакласці на беларускую мову рускамоўную песню. Нічога не атрымалася. І я зразумеў: трэба пісаць самому. Прычым беларускую мову я ў школе не вывучаў. Тым не менш песня атрымалася. Цяжка сказаць, ці напісаў хто нешта раней, але я лічу, што «Айчыны нашай сцяг» — гэта першая беларускамоўная песня пра сучасную беларускую армію.

— ... якую заспявалі не толькі салдаты вашай роты, а і многія беларусы на парадах у Мінску 3 ліпеня...

— Я ніколі не думаў ні аб якой славе. Галоўным для мяне было стварыць песню для сваёй роты. Вайскоўцам яна прыйшлася даспадобы, і я напісаў па беларускамоўнай песні для кожнай роты свайго батальёна. Потым пачалі звяртацца з суседніх батальёнаў. Вось гэта для мяне вышэйшае прызнанне. А ў тым, што песні выйшлі на больш шырокую аўдыторыю, дапамог першы фестываль армейскай песні «Звезда» — тады ён называўся ўсеармейскім тэлевізійным фестывалем салдацкай песні. Пяць разоў я станавіўся яго лаўрэатам. І кожны раз выконваў аўтарскія песні, прычым толькі на беларускай мове.

— Адкуль такая любоў да мовы, калі вы нават не вывучалі яе ў школе?

— Тут, напэўна, сыграла ролю любоў не столькі да мовы, колькі да Радзімы. А што такое Радзіма без мовы? Як яшчэ адрозніць, што вы жывяце ў Беларусі? Калі я вучыўся ў Чарапаўцы, у Валагодскай вобласці, я выпісваў вялікую колькасць газет з Беларусі, у тым ліку беларускамоўныя «Звязду», «Чырвоную змену». Але ў мяне шмат і рускамоўных песень. Пра каханне, чамусьці, лепш пішацца па-руску. Пра Радзіму, армію — на роднай мове.

— Вы не толькі станавіліся лаўрэатам фестывалю армейскай песні «Звезда», некалькі гадоў і арганізоўвалі яго. Сёння канкурсанты актыўна выконваюць вашы песні. Але не сакрэт, што ў цывільным жыцці вайсковыя песні не карыстаюцца асаблівай папулярнасцю...

— Справа ў тым, што песні на армейскую тэматыку, песні для строю — не камерцыйныя. У асноўным іх пішуць прафесійныя ваенныя музыкі для сваіх калектываў. Сёння зрабіць больш-менш якасную аранжыроўку каштуе вялікіх грошай. Таму калі ў адборачным туры фестывалю бачыў, што хлопец або дзяўчына добра спяваюць, але песня, што называецца, не тая, з задавальненнем прапаноўваў сваю. І вельмі прыемна, што многія з гэтых людзей сталі не толькі лаўрэатамі фестывалю, а і салістамі прафесійных калектываў. У першую чаргу ансамбля песні і танца Узброеных Сіл Беларусі. Дарэчы, голас ансамбля, Яўгена Гушчу, мы знайшлі ў Бабруйску. Хлопец працаваў звычайным грузчыкам, але Бог даў яму шыкоўны голас. З фестывалю выйшлі Руслан Аляхно, былы саліст «Песняроў» Андрэй Усанаў, Рада Сямёнава, якая працавала ў Прэзідэнцкім аркестры, вядомы на ўсёй постсавецкай прасторы бард авіяцыйнай песні Мікалай Анісімаў. І такіх шмат.

— У вашага канала на YouTube — больш як два мільёны праглядаў. Што кажа статыстыка — хто цікавіцца ваенна-патрыятычнай, у тым ліку беларускамоўнай песняй?

— Жыхары больш як 200 краін праглядаюць мой канал, а значыць слухаюць беларускія армейскія песні. Уся Еўропа, Азія, амаль уся Паўднёвая Амерыка і нават Афрыка цікавяцца кантэнтам канала. Калі казаць пра лідараў, то на першым месцы па колькасці праглядаў — Расія. Зразумела, вялікая тэрыторыя, шмат насельніцтва. На другім — Беларусь. На трэцім — Украіна, а на чацвёртым — увага! — Германія. Прычым нашай ваенна-патрыятычнай песняй цікавіцца некалькі соцень тысяч немцаў. Як ні дзіўна, слухаюць яны ў асноўным песні пра Вялікую Айчынную вайну. Што тычыцца беларускай армейскай песні, то найбольшай папулярнасцю яна карыстаецца ў расіян. Чым беларуская песня адрозніваецца ад расійскай? Наша больш пазітыўная. У нас, на шчасце, ніякіх баявых дзеянняў няма, таму няма нагоды для суму. Аднойчы пад адным з маіх відэа ў інтэрнэце быў прыкладна такі каментарый: што гэта, маўляў, за палкоўнік, у якога няма ніводнай баявой узнагароды, адны юбілейныя. А я ганаруся тым, — адказваю я яму, — што ў мяне няма ні адной баявой узнагароды, ганаруся за сваю дзяржаву, дзякуючы міралюбівай палітыцы якой цэлае пакаленне афіцэраў Беларусі не ўдзельнічала ў баявых дзеяннях!

— Сапраўды, дзякуй Богу, што над нашымі галовамі — мірнае неба. Аддаляюцца падзеі Вялікай Айчыннай вайны. Яшчэ некалькі гадоў — і новае пакаленне беларусаў ужо ніколі не пачуе пра трагічныя падзеі з першых вуснаў. Можа, хоць нешта ім раскажа ваенна-патрыятычная песня? Ці ёсць у яе будучыня?

— Што тычыцца песень пра сучасную армію, іх вельмі актыўна пішуць, у тым ліку расійскія і ўкраінскія аўтары. У ваенна-патрыятычнай песні, пад якой я маю на ўвазе творы пра Вялікую Айчынную вайну, безумоўна, ёсць будучыня. Яна дзеля таго і існуе, каб захоўваць памяць пра ветэранаў, нашых бацькоў, дзядоў і прадзедаў.

Вераніка КАНЮТА.
kanyuta@zviazda.by
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА

■ Альма-матар

ЯК ЗАГАРТОЎВАЦЬ ХАРАКТАР

У Мінскім суворaўскім ваенным вучылішчы з'явіўся ўнікальны шматфункцыянальны спартыўны комплекс

Шыкоўны падарунак у канцы навучальнага года атрымалі выхаванцы Мінскага суворaўскага ваеннага вучылішча. Сумеснымі намаганнямі Міністэрства абароны, Банка развіцця Беларусі і выпускнікоў вучылішча на тэрыторыі навучальнай установы адкрыўся шматфункцыянальны спартыўны комплекс.

На ім сваё майстэрства змогуць удасканальваць як звычайныя суворaўцы, так і выхаванцы спецыялізаваных па спорце класаў. Комплекс уключае ў сябе два полі — для гульні ў футбол і гандбол, паласу перашкод, пляцоўку для заняткаў па страявой падрыхтоўцы і нават трэнажорную залу пад адкрытым небам.

— Шматфункцыянальны спартыўны комплекс несумненна дазволіць падняць на новы якасны ўзровень спартыўную падрыхтоўку суворaўцаў, — лічыць **міністр абароны генерал-лейтэнант Андрэй РАЎКОЎ**. — Мінскае суворaўскае ваеннае вучылішча заўсёды было адным з лідараў у сістэме агульнай сярэдняй адукацыі краіны, адпраўной кропкай у жыцці і пачатковым звяном ваеннай кар'еры для тысяч і тысяч маладых людзей. У вучылішчы створаны ўсе ўмовы для падрыхтоўкі будучых абаронцаў Айчыны.

Як пераканаты **старшыня праўлення Банка развіцця Беларусі, старшыня Беларускай федэрацыі футбола Сяргей РУМАС**, тут, у вучобе, спартыўных трэніроўках, ваенных вучэннях, загартоўваецца характар юнакоў, фарміруюцца высокія маральныя і духоўныя якасці.

«Мы, выпускнікі ваеннага вучылішча, у свой час вельмі зайздросцілі кадэтам, якія вучыліся разам з намі, бо, акрамя ваеннай выпраўкі, гэтыя юнакі выдатна маглі падшываць падкаўнерыкі, што не ўдавалася нам, а фізічная падрыхтоўка, асабліва ў выпускнікоў Мінскага суворaўскага ваеннага вучылішча, была на вышыні, — адзначыў асноўны спонсар праекта. — З першых дзён існавання ваша ўнікальная навучальная ўстанова славілася цудоўнымі выкладчыкамі, а таксама выдатнай якасцю адукацыі. Традыцыйным важным адрозненнем ва ўсе часы было спалучэнне грунтоўнай тэарэтычнай і належнай фізічнай падрыхтоўкі. Веды і навыкі, якія юнакі атрымліваюць у сценах вучылішча, выключна важныя для нашай Радзімы. Ваенны афіцэр — гонар краіны. А як вядома, здаровы дух павінен быць у здаровым целе. І хто яго ведае, можа быць, на гэтым полі вырастуць будучыя гульцы нацыянальнай зборнай па футболе. І не адзін, а цэлая каманда».

Тое, што дзеля гэтага ёсць усе падставы, тут жа суворaўцы і прадэманстравалі. Пасля ўрачыстага адкрыцця спартыўнага комплексу адбыўся таварыскі матч па футболе паміж прадстаўнікамі Банка развіцця і зборнай камандай суворaўскага вучылішча. Суворaўцы не падвялі: сваёй перамогай яны яшчэ раз даказалі, што недарэмна атрымалі такі падарунак.

Традыцыйна развіццю спорту ў Мінскім суворaўскім ваенным вучылішчы надаюць вялікую ўвагу. За апошнія гады вучылішча закранула істотная мадэрнізацыя і рэканструкцыя важных навучальных, спартыўных і камунальных аб'ектаў. У вучэбных класах, спартыўнай зале, на стадыёне, пляцы, а таксама на іншых аб'ектах установы праведзены капітальны рамонт. Сёння тут створаны ўсе ўмовы для ўсебаковага і гарманічнага развіцця суворaўцаў.

— З адкрыццём шматфункцыянальнага спартыўнага комплексу мы, па сутнасці, поўнасцю завяршылі рэканструкцыю вучылішча адносна матэрыяльнай базы, — адзначыў **начальнік Мінскага суворaўскага ваеннага вучылішча генерал-маёр Віктар ЛІСОЎСКІ**. — Што да рэканструкцыі вучэбнай базы, яна створана і паспяхова эксплуатуецца.

Сёлета суворaўскае вучылішча адзначае сапраўды вялікае свята — 60-ы выпуск выхаванцаў. За слаўную гісторыю існавання навучальнай установы ў яе сценах атрымалі пуцёўку ў жыццё больш як 12 тысяч юнакоў, многія з якіх сталі вядомымі ваеначальнікамі і выдатнымі афіцэрамі. Больш чым 60 выпускнікоў атрымалі генеральскія пагоны, больш за сотню носяць ганаровыя званні кандыдатаў навук, дацэнтаў і прафесараў. Хто яго ведае, можа, менавіта з гэтых сцен неўзабаве выйдуць і будучыя майстры спорту ці нават алімпійскія чэмпіёны?

Вераніка КАНЮТА.
kanyuta@zviazda.by
Фота Надзеі БУЖАН

■ Абеліскі параненай зямлі

ЛОЎЖА, ВЁСКА-ПАРТЫЗАНКА

Памяць аб яе расстраляных жыхарах жыве і сёння

Адной з мясцін, непасрэдна звязаных з гераічным подзвігам савецкага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, з'яўляецца вёска Лоўжа Шумілінскага (колішняга Сіроцінскага) раёна. Большасць выпускнікоў Лаўжанскай школы першага — 1941 года — выпуску пайшлі добраахвотнікамі на фронт. Многія ўдзельнічалі ў партызанскім руху са сваімі настаўнікамі. Мясцовыя жыхары чым маглі дапамагалі партызанам. За гэта паплаціліся жыццём. У напамін аб жудаснай трагедыі застаўся помнік...

Сарціроўка жыхароў

Вогненны смерч пранёсся над Лоўжай увосень 1942 года. Раніцай 15 кастрычніка гітлераўцы акружылі вёску. Старых, жанчын і дзяцей сагналі ў драўляны будынак школы...

З успамінаў Зінаіды Грузневіч, ураджэнкі вёскі Лоўжа, партызанкі атрада «Грозны» брыгады імя Кароткіна: «Позна ноччу 14 кастрычніка 1942 года дадому з заданнем прыйшоў мой брат Дзмітрый, партызан. На досвітку я пачула нямецкую мову і папярэдзіла брата, што ў вёсцы немцы. Ён залез на гарышча і схаваўся ў сене. Я ведала, што ў яго з сабою быў аўтамат і дзве ручныя гранаты. Калі немцы зайшлі ў хату, адзін з іх узяў вілы і пачаў тыкаць імі ў сена, але нікога не знайшоў. Мяне, сястру Варвару з малалетнім сынам Валодзем і жонку брата Дзмітрыя з дзвюма дочкамі пагналі ў школу. Карнікі дапытвалі вяскоўцаў. Дапамагалі фашыстам здраднікі. Ішла сарціроўка жыхароў: тых, каго збіраліся расстрэльваць, праводзілі ў іншы пакой, астатніх, арыштаваных, — у вялікі клас. Будынак школы быў акружаны».

Увечары пасля крывавай расправы над жыхарамі Лоўжы ўсіх, хто застаўся ў жывых, выпусцілі са школы. Праўда, пад пагрозай, што калі насельніцтва будзе прадаўжаць дапамагаць партызанам, то ўсіх чакае такі ж лёс. На наступную ноч Зінаіда Грузневіч і яшчэ некалькі чалавек пайшлі ў партызаны.

Вяртанне з таго свету

— На допыце Дударaў заявіў, што мой брат пайшоў у партызаны добраахвотна і ўдзельнічаў у разгроме карнага атрада каля Вербелянскіх могілак, — расказвала Ядзвіга Гушча, якая была арыштавана разам з маці, сястрой і малодшым братам. Увечары нас вывелі са школы і пагналі да ямы. Каля яе фашысты скамандавалі стаць на калені, але на калені ніхто не стаў. Нават малалетнія дзеці. Назаўсёды ў маёй памяці засталіся шалёная страляніна фашыстаў, стогны, слёзы, крыкі жанчын, дзяцей, кроў. Калі пачуліся стрэлы, нехта пры падзенні зачапіў мяне, і я жывой звалілася ў яму, страціўшы прытомнасць. Калі ачулася, цьмяна бачыла, як немцы дабівалі параненых рыдлёўкамі, тапталі іх нагамі, а ў тых, хто варушыўся, стралялі. Карнікі кудысьці спяшаліся, да таго ж і хваляваліся, каб ноччу не напалі партызаны, таму вырашылі закапаць яму раніцай. Ноччу мяне выцягнулі з ямы.

Расстраляныя...

Фрузе Мельнікавай перад вайной споўнілася 18 гадоў. Камсамольскі лідар, яна з першага дня стала сувязной партызанскага атрада. Разам з камсамолкай Надзеяй Емяльянавай распаўсюджвала лістоўкі. У партызанах былі і яе старэйшыя браты — Міхась і Фёдар. Фрузу расстралялі разам з бацькам.

Помнік на брацкай магіле, дзе пахаваны жыхары вёскі Лоўжа.

Сярод расстраляных гітлераўцамі 15 кастрычніка 1942 года — і Ефрасіння Матузава. У партызанскай брыгадзе імя Кароткіна ваявалі яе сыны Леанід і Аляксандр, якіх назаўсёды забрала вайна. Былая калгасніца, дэпутат сельскага савета, яна таемна пякла хлеб, збірала адзенне і абутак для партызан. Разам з сёстрамі выратавала і пераправіла ў партызанскую зону параненага савецкага лётчыка. Страшна здзекаваліся нямецкія карнікі з яе маці, Наталлі Жарабцовай. Перад расстрэлам звязалі рукі калючым дротам, катавалі, патрабавалі, каб яна паведаміла, дзе знаходзяцца яе дочкі і ўнукі.

Варожыя кулі абарвалі тады і жыццё Варвары Галузы (Малашонак) і яе малалетняга сына Толі. Цудам уцалеў яе бацька Максім Васілевіч, які жывым зваліўся ў яму, а позна ўвечары выбраўся з яе. Два яе браты — Міхаіл (камандзір атрада «Грозны») і Пётр Галуза (камандзір аддзялення атрада «Грозны» брыгады імя Кароткіна) загінулі ў 1942 — 1944 гадах.

Карнікі расстралялі Герасіма Купрыянава. Тры яго сыны — Аляксандр, Уладзімір, Мікалай — помсцілі за смерць бацькі ў партызанскіх атрадах. Мікалай Купрыянаў, падрыўнік-кулямётчык, гераічна змагаўся з акупантамі і загінуў у баі 29 ліпеня 1944 года.

Трагічным стаўся лёс і ў Анісіма Сцяпанава, чый старэйшы сын Андрэй быў разведчыкам у партызанскай брыгадзе імя Леніна. Яго хата ў вёсцы Сосны стаяла наводшыбе і была явачнай кватэрай для партызан, сувязных, агентурных разведчыкаў, якіх закідвалі ў нямецкі тыл з Вялікай зямлі. На гарышчы партызаны хавалі зброю.

Трагедыя адной сям'і

З болем успамінае жудасныя падзеі нямецкай акупацыі Ксенія Анісімаўна. На яе вачах нямецкія карнікі разам з паліцаямі спалілі хату Волкава. Партызанскія сем'і Волкавых, Макаравых з дзецьмі арыштавалі і вывезлі ў Шуміліна, дзе і расстралялі. Вось што яна расказала: «Перад вайной памерла маці. У бацькі засталося нас чацвёра: старэйшы сын і тры дачкі. Мне было тады 10 гадоў, малодшай сястры Сашы — восем. Летам 1942 года брат Андрэй пайшоў у партызаны. Падтрымліваў сувязь з партызанамі і бацька. Яны часта збіраліся ў нашай хаце, абменьваліся інфармацыяй, грэліся, сушылі вопратку, некаторыя заставаліся начаваць.

15 кастрычніка бацька ўстаў рана і пайшоў да дзядзькі Цімафея ў вёску Пагост. Я дзесьці а восьмай гадзіне раніцы павяла ў поле карову. З-за пагорка выйшаў немец і стаў нешта крычаць. Я нічога не зразумела. Ён стаў паказваць рукой, каб я ішла ў бок царквы. Па дарозе я зайшла да цёткі Каці, але ў хаце нікога не было. Палілася печ, дыміліся катлы. Я зразумела, што ўсіх з хат павыганялі, і пайшла ў школу. Калі на допыт вызвалі цётку Кацю з дзецьмі, яна ўзяла мяне за руку і павяла ў пакой, дзе немцы дапытвалі мясцовых жыхароў. Калі нямецкі камендант спытаў, чыё гэта дзіця, яна адказала, што гэта сірата. Нас адправілі ў вялікі клас. Пасля некалькі чалавек расстралялі. Астатніх адпусцілі. Я падышла да ямы і ўбачыла бацьку, які ўвесь у крыві ляжаў зверху...»

***

Толькі за двое сутак пасля крывавай расправы ў вёсцы Лоўжа ў рады партызан уступілі больш за 300 жыхароў навакольных вёсак. Звыш 80 лепшых сыноў і дачок вёскі аддалі сваё жыццё ў барацьбе з фашыстамі ў партызанскіх атрадах і на франтах Вялікай Айчыннай вайны.

Віктар ГРУЗНЕВІЧ, *г. Віцебск*

■ Салдат Перамогі

НЕПАЎНАЛЕТНІ БАЕЦ

Сваё дзевяностагоддзе сёлета адсвяткаваў адзін з удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, жыхар горада Іванава Брэсцкай вобласці Аляксей Піліпавіч Леванчук. Са слаўным юбілеем яго павіншавалі раённая ветэранская арганізацыя і мясцовыя ўлады.

У 1943 годзе Аляксей Леванчук у пятнаццацігадовым узросце разам з маці і сёстрамі ўступіў у партызанскі атрад імя Кірава, які дзейнічаў у Іванаўскім раёне каля вёскі Завышша і ўваходзіў у брыгаду генерала Васіля Бегмы. У атрадзе Аляксей Піліпавіч удзельнічаў у аперацыях па падрыве чыгункі і ў выхадзе з нямецкай блакады падчас злучэння з Чырвонай Арміяй. За ўдзел у ваенных дзеяннях узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалём «За баявыя заслугі».

Пасля вызвалення Беларусі ён быў накіраваны ў Ровенскую вобласць з мэтаю ўсталявання там савецкай улады, дзе працаваў на пасадзе ўчастковага міліцыянера. Шаснаццацігадоваму юнаку часта даводзілася прымаць складаныя рашэнні ў вельмі цяжкіх умовах — на вызваленых тэрыторыях дзейнічалі бандэраўцы. У гэты ж суровы час ён даведаўся пра смерць свайго бацькі Піліпа Антонавіча, які загінуў на фронце ў Прыбалтыцы.

Праз два гады работы на Украіне Аляксея Леванчука накіравалі ў Беларусь. Неўзабаве ён вярнуўся ў роднае Іванава. Працаваў на розных пасадах, давучваўся ў школе, якую з-за вайны не паспеў скончыць. З 1955 года і да пенсіі ён быў намеснікам галоўнага ўрача па гаспадарчай частцы раённай бальніцы. З работніцай чыгункі Надзеяй Мікалаеўнай стварыў дружную сям'ю, у якой нарадзілася тры дачкі — Ніна, Алена і Марыя. Сёння ў Аляксея Піліпавіча падрастаюць праўнукі.

Нягледзячы на ўзрост, ветэран застаецца малады духам, удзельнічае ў розных раённых мерапрыемствах і святах — іванаўцы з пашанаю ставяцца да яго. Яму прысвечаны старонкі кнігі «Аб подзвігу, аб гераізме, аб славе», якую ўклала супрацоўніца Іванаўскай раённай газеты «Чырвоная звязда» Марыя Гарупа. У адказ на пытанне, ці часта ён сустракаецца са сваімі баявымі таварышамі, Аляксей Піліпавіч разгублена паціскае плячыма: «Нікога з іх ужо даўно няма...»

Ганна СМІЛЕВІЧ, вучаніца 11 класа СШ № 4 горада Іванава

ІНІЦЫЯТЫВА ДЭЛЕГАТА ПАДТРЫМАНА

У Санкт-Пецярбургу, у акруговым Доме афіцэраў Заходняй ваеннай акругі, адбылася ўрачыстая цырымонія занясення імя знакамітага снайпера Вялікай Айчыннай вайны, Героя Савецкага Саюза, ураджэнца Беларусі — Фядосія Арцёмавіча Смалячкова – у Памятныя лісты «Залатой Кнігі» Санкт-Пецярбурга.

Арганізатарамі ўрачыстага мерапрыемства выступілі аб'яднанне «Залатая Кніга Санкт-Пецярбурга», Расійскае ваенна-гістарычнае таварыства і Ваенна-гістарычны цэнтр РВГТ Паўночна-Заходняй федэральнай акругі, пры падтрымцы і ўдзеле Міхайлаўскай ваеннай артылерыйскай акадэміі.

Падобныя мерапрыемствы арганізуюцца і праводзяцца з мэтай захавання памяці аб вялікім мінулым нашай Айчыны. Іх задача — раскрыць і паказаць вытокі гераізму і патрыятызму воінаў, непераможнасць і веліч савецкага народа. І арыентаваны яны, у першую чаргу, на маладзёжную аўдыторыю — пакаленне XXI стагоддзя. Таму іх удзельнікамі, як на сцэне, так і ў зале, з'яўляецца моладзь рознага ўзросту: навучэнцы школ і гімназій, выхаванцы кадэцкіх карпусоў, курсанты ваенных вучылішчаў. Перадача эстафеты славы — адна з галоўных задач падобных мерапрыемстваў, у сувязі з гэтым іх удзельнікамі нязменна з'яўляюцца ветэраны і прадстаўнікі старэйшых пакаленняў.

Фядосій Смалячкоў — ураджэнец Магілёўшчыны. Аддаючы даніну памяці свайму земляку, для ўдзелу ва ўрачыстасці са сталіцы Беларусі па запрашэнні піцерцаў прыбыў **заснавальнік Дабрачыннага фонду імя танкіста З.Г. Калабанава, дэлегат V Усебеларускага народнага сходу, аўтар некалькіх кніг пра вайну — Васіль Рыгоравіч МОНІЧ**.

У выступленнях гасцей цырымоніі неаднаразова адзначалася, што Смалячкоў — не першы ўраджэнец зямлі беларускай, занесены ў Памятныя лісты піцерскай «Залатой Кнігі». Так, у яе ўжо занесена імя выхадца з беларускага горада Талачына, танкіста Андрэя Міхайлавіча Усава, які прымаў удзел у 1941 годзе ў баі пад Гатчынай у складзе легендарнага экіпажа З.Г. Калабанава (імя якога таксама ў «Залатой Кнізе»). Нагадаем, «Звязда» ўжо неаднаразова пісала пра подзвіг, які быў здзейснены савецкімі танкістамі ў жніўні 1941 года, калі экіпаж танка КВ-1 у адным баі знішчыў 43 баявыя машыны вермахта, тым самым прадухіліўшы імклівы захоп гітлераўцамі горада на Няве.

Выступаючы ў ходзе цырымоніі, грамадскі дзеяч і мецэнат Васіль Моніч прапанаваў арганізацыйнаму камітэту «Залатой Кнігі» ўнесці ў яе імёны яшчэ некалькіх беларусаў, чый уклад у агульную Перамогу над фашызмам неацэнны. Гэта могуць быць, напрыклад, вядомыя ваеначальнікі часоў Вялікай Айчыннай вайны — маршалы Іван Ігнатавіч Якубоўскі, Васіль Данілавіч Сакалоўскі, генерал арміі Аляксей Інакенцьевіч Антонаў. Або партызанскі камандзір бацька Мінай (Мінай Піліпавіч Шмыроў), які страціў у засценках гестапа ўсю сям'ю, але не скарыўся гітлераўцам. Кнігу памяці, безумоўна, упрыгожыць слаўная біяграфія знакамітага авіяканструктара Паўла Восіпавіча Сухога, чые выдатныя крылатыя тварэнні і сёння стаяць на варце мірнага неба Саюзнай дзяржавы. Будучым пакаленням, напэўна, карысна было б даведацца і пра гераізм сям'і простай беларускі Настассі Фамінічны Купрыянавай, пяцёра сыноў якой загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны...

І падобных годных прыкладаў самаахвярнага служэння народу можна прыводзіць яшчэ вялікае мноства. Біяграфіі каго з дастойных патрапяць на старонкі «Залатой Кнігі» Санкт-Пецярбурга — пакажа час, але ўжо сёння аргкамітэт Кнігі пагадзіўся з прапановай Васіля Моніча аб унясенні ў яе імёнаў выдатных беларусаў.

Уладзімір АЛЯКСАНДРАЎ.